НАВАЧАССЕ, -я, *н.* Новы час. *Правінцыйныя літаратары, якія ніколі не жылі выключна з літаратуры, нават і не заўважылі прышэсьця прыкрага* ***навачасься*** (Наша Ніва. 31.01.2000).

НАВЕДНІК, -а, *м.* Наведвальнік. *Старшыня РВК... перш не зважаў зусім на несамавітага* ***наведніка*** (М. Зарэцкі). — *Мне патрэбна работа, каб жыць, — сказаў* ***наведнік*** (ЛіМ. 24.05.1991).

НАВЕДНІЦА, -ы, *ж. Жан. да* наведнік. *Круглоў зірнуў на* ***наведніцу*** *і, хоць пазнаў яе, зрабіў выгляд, што бачыць першы раз* (Р. Сабаленка).

НАВЕЛЬКІ, *прысл.* Велічынёю, на рост. *Хай сабе з волата будзеш* ***навелькі****, Высахне сіла, пойдзе на скон...* (В. Зуёнак).

НАВІДАВОКУ, *прысл.* ... У полі зроку. *Адно несумненна — перад намі даволі багатая зместам публіцыстыка калі не самога Кастуся, дык школы Каліноўскага, якая павінна быць* ***навідавоку*** *ў нашых даследчыкаў* (Г. Кісялёў).

НАВІК, -а, *м.* Навічок. *Неакуратны ж і неадначасны збор перашкаджае нармальнаму ходу заняткаў. Дык лепш наўперад склікаць адных* ***навікоў****, падагнаць іх трохі, а ўжо крыху пазней сабраць рэшту вучняў* (Я. Колас).

НАВІЦЬ, наўлю, новіш, новіць; *незак., што.* Абнаўляць. *Маладзік узыдзе, Неба багну* ***новячы****, Матылёк, Як марная парада, ўецца* (Р. Барадулін).

НАВОДЗІЦЬ, -воджу, -водзіш, -водзіць; *незак., што.* Наладжваць, устанаўляць. *Не толькі маральнасцю жыве гэтая жанчына, але і справай: дапамагае ладзіць навучанне нашых урачоў,* ***наводзіць*** *кантакты між ЗША і Беларуссю і г. д.* (ЛіМ. 27.12.1991).

НАВОЗЫ, -аў. Поле за загуменнем. *А цяпер зямля гэтага не родзіць. Я летась — дзе на* ***навозах*** *— насення не сабраў!..* (Я. Лёсік).

НАВОСЛЕП, *прысл.* Усляпую, наўгад. *Раз'ятраная паліцыя, доўга не думаючы, кінулася* ***навослеп*** *арыштоўваць жыхароў, за якімі значыліся грахі ўдзелу ў рабоце органаў савецкай улады* (У. Калеснік).

НАВОТЛІЎ, НАВОДЛІЎ, НАВОТЛЯЎ, НАВОТЛЯХ, *прысл.* З размаху, наводмаш. — *Эй, вы, пайшлі вон! — зняўшы з лысаватае ўзмакрэлае галавы вушатую кепку, Грабянка махнуў ёю* ***навотліў****...* (В. Адамчык). *Жэнік Рэпка* ***наводліў*** *шпурнуў ссечаную, у празрыстай чырвані ядроных ягад каліну* (В. Адамчык). — *Здэцца, урэзаў бы* ***навотляў*** *і табе, і тваёй бабе! — Валодзя Белы смачна пазяхае...* (В. Гардзей). *Генадзь на яе зірнуў так, як выцяў* ***навотлях****, і Вікторыя асеклася* (Р. Сабаленка).

НАВУКОВЕЦ, -коўца, НАВУКОЎЦА, -ы, *м.* Той, хто займаецца навуковай працай. *У планах аргкамітэта правесці ў Полацку ўрачысты вечар. Выступяць* ***навукоўцы*** (Звязда. 31.08.1990). *Гэта — былы выпускнік,* ***навуковец*** *А. Скуратовіч* (Настаўніцкая газета. 16.11.2000). *Падумалася, што з'явіўся новы руплівы* ***навукоўца****, знаўца гісторыі беларускага нацыянальнага руху* (Роднае слова. 2000. № 7).

НАВУКОЎКА, -і, *ж. Жан. да* навуковец, навукоўца. [Закончыліся] *пленарныя пасяджэнні дакладам* ***навукоўкі*** *з Віцебска Людмілы Вакар* (ЛіМ. 3.10.1997).

НАВУЧАЛЬНІК, -а, *м.* Той, хто навучае каго-н. [Вядомы артыст Сырамятнікаў] *спрытна загрыміраваўся пад* ***навучальніка*** *моладзі тэатральнаму мастацтву* (М. Лужанін).

НАВУЧАНКА, -і, *ж.* Павучанне, парада. *І прабіла час хлапчыне Гнаць у поле са двара. Ён праслухаў* ***навучанку****, Як быць добрым пастухом* (Я. Колас).

НАГАДАК, -дку, *м.* Напамін. *Нагадак пра часнок выклікаў пякучы голад* (А. Асіпенка).

НАГАДЛІВА, *прысл.* Нагадваючы. *Забыццё — не асцё, Ды* ***нагадліва*** *коле, Успамін — не язмін, Ды ўквячае сляды* (Р. Барадулін).

НАГАСЦЯВАНЫ, -ая, -ае. Які нагасцяваўся. *З усяго гэтага сумачнага натоўпу,* ***нагасцяванага****, расчырванелага, найбольш кідалася ў вока ўгледжаная таўсматая дзяўчына ў джынсавых штанах* (А. Жук).

НАГНУТЫ, -ая, -ае. Які нагнуўся; схілены. *У рачулцы на дне ляжала белае каменне, а там, дзе жаўцеў пясок, краталася ад вады* ***нагнутая*** *трава* (І. Пташнікаў).

НАДАРАНЫ, -ая, -ае. Які надарыўся, выпаў. *Перад намі, хвілінай* ***надаранай****, Кіпарысы згінаюць камлі* (У. Хадыка).